**Р а з д е л 6**

# ОБРАЗОВАНИЕ ВЗРОСЛЫХ В СИСТЕМЕ НЕПРЕРЫВНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ПЕДАГОГОВ

*І.А.Андарала, выкладчык каф. эканамічнай геаграфіі БДПУ, тэл. (8-0172) 64-77-05 (г.Мінск)*

## ЗАВОЧНАЯ ВЫШЭЙШАЯ ПЕДАГАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ ЯК ПАДСІСТЭМА БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ НАСТАЎНІКАЎ

Соцыякультурная сітуацыя, што склалася ў краіне, працэсы, якія адбываюцца ў яе сучаснай адукацыйнай практыцы, надзвычайна актуалізавалі праблему падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў, распрацоўку яе тэарэтычных і арганізацыйна-педагагічных асноў.

У агульнай структуры нацыянальнай вышэйшай педагагічнай школы значнае месца займае завочная вышэйшая педагагічная адукацыя, паколькі кожныя два з пяці студэнтаў, будучых педагогаў, з'яўляюцца завочнікамі. Гэта дае падставу разглядаць завочную вышэйшую педагагічную адукацыю як адносна самастойную састаўную частку (падсістэму) некалькіх сістэм больш высокага парадку: сістэмы бесперапыннай адукацыі; адукацыйнай сістэмы краіны; сістэмы вышэйшай педагагічнай адукацыі краіны.

На першых этапах сваёй гісторыі завочная вышэйшая педагагічная школа выступала як сістэма павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, бо камплектавалася выключна настаўнікамі-практыкамі, якія не мелі адпаведнай педагагічнай адукацыі. Як правіла, студэнты-завочнікі адчувалі вострую патрэбу ў павышэнні свайго тэарэтычнага (спецыяльнага, псіхолага-педагагічнага і метадычнага) узроўню. Такім чынам, ужо на пачатковай стадыі свайго развіцця сістэма завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі выконвала функцыю забеспячэння бесперапыннасці педагагічнай адукацыі.

Па меры насычэння агульнаадукацыйнай школы і сістэмы адукацыі і выхавання наогул педагагічнымі кадрамі з вышэйшай адукацыяй у кантынгенце завочных аддзяленняў вышэйшых педагагічных навучальных устаноў назіраецца паступовае змяншэнне колькасці студэнтаў-завочнікаў з ліку настаўнікаў-практыкаў. Гэта тэндэнцыя мае месца і ў наш час, што пацвярджаецца статыстычнымі дадзенымі, атрыманымі намі ў выніку аналізу кантынгенту студэнтаў-завочнікаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Згодна з гэтай статыстыкай, толькі 42 % студэнтаў-завочнікаў названай навучальнай установы з'яўляюцца настаўнікамі адпаведнай школьнай вучэбнай дысцыпліны. Яшчэ 36 % кантынгенту складаюць асобы, практычная дзейнасць якіх нейкім чынам звязана з адукацыяй і выхаваннем. 22 % студэнтаў-завочнікаў наогул не працуюць у сістэме адукацыі і выхавання. На асобных факультэтах БДПУ працэнт завочнікаў, якія не працуюць настаўнікамі, яшчэ вышэйшы. Так, на завочным аддзяленні факультэта прыродазнаўдтва (спецыяльнасць «Геаграфія») настаўнікі геаграфіі складаюць толькі 10 % ад агульнай колькасці студэнтаў-завочнікаў. 40 % кантынгенту завочнікаў факультэта – гэта асобы, вытворчая дзейнасць якіх зусім не мае дачынення да педагагічнай прафесіі. Прыблізна такая ж статыстыка назіраецца і на завочным аддзяленні гістарычнага факультэта.

Паралельна са зменамі кантынгенту студэнтаў сістэмы завочнай педагагічнай адукацыі ў напрамку адпаведнасці іх практычнай дзейнасці профілю педагагічнай спецыяльнасці, якую яны атрымліваюць у ВНУ, адбывалася і амаладжэнне статыстычнага студэнта-завочніка. Сёння гэта ўжо не тыя сталыя, са значным вопытам вучэбна-выхаваўчай работы ў школе настаўнікі, а, як правіла, учарашнія выпускнікі сярэдніх агульнаадукацыйных школ або выпускнікі сярэдніх спецыяльных педагагічных навучальных устаноў, у якіх нават пры фармальнай адпаведнасці профілю работы профілю вучобы ў ВНУ практычны вопыт яўна недастатковы, каб гаварыць пра высокі ўзровень іх прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў. Прааналізаваныя намі вышэй змены ў якасным саставе кантынгенту сучаснай сістэмы завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыі даюць падставу выявіць тэндэнцыю да значнага павелічэння ў апошні час колькасці студэнтаў-завочнікаў, якія маюць патрэбу не ў павышэнні кваліфікацыі, а ў набыцці яе. Такім чынам, першапачатковая задача –павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, не маючых адпаведнай педагагічнай адукацыі, якая стаяла перад завочнай вышэйшай педагагічнай адукацыяй, відазмянілася і набыла дыферэнцаваны характар. Нараўне з павышэннем прафесійнай кваліфікацыі настаўнікаў, час і абставіны паставілі перад завочнай вышэйшай педагагічнай школай не менш важную і складаную задачу: ва ўмовах больш абмежаванага, чым у стацыянарнай ВНУ, бюджэту вучэбнага часу падрыхтаваць спецыяліста-настаўніка вышэйшай кваліфікацыі з ліку асоб, адносна далёкіх ад педагагічнай дзейнасці.

Інтэнсіўныя дэмаграфічныя змены, якія адбываюцца ў краіне, прывялі да лішку настаўнікаў пэўных школьных дысцыплін. У сувязі з гэтым завочная вышэйшая педагагічная школа ўзяла на сябе і функцыю перападрыхтоўкі педагагічных кадраў. Як паказвае практыка апошніх гадоў, гэтая функцыя мае тэндэнцыю да пашырэння, што сведчыць аб

узрастанні ролі завочнай вышэйшай педагагічнай школы ў якасці важнейшага звяна сістэмы бесперапыннай адукацыі.

*А.І.Андарала, канд. пед.навук, дацэнт,*
*прарэктар БДПУ, тэл. (8-0172) 64-77-05 (г.Мінск)*

## ПАВЫШЭННЕ ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ ВЫКЛАДЧЫКА – НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ ВНУ

Станаўленне Рэспублікі Беларусь як сувярэннай дзяржавы, эканамічныя соцыякультурныя змены, што адбываюцца ў краіне ў апошняе дзесяцігоддзе, абумовілі вострую неабходнасць у рэфармаванні ўсёй існуючай нацыянальнай сістэмы адукацыі. Канчатковай мэтай гэтай рэформы з'яўляецца стварэнне дзяржаўнай сістэмы бесперапыннай адукацыі, якая разам з дашкольнай, агульнай школьнай. спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыямі, сістэмай падрыхтоўкі навуковых кадраў арганічна ўключае і сістэму павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі спецыялістаў.

Існуючая ў краіне сістэма паслядыпломнай прафесійнай адукацыі на працягу многіх гадоў эфектыўна забяспечвала задавальненне патрэбнасцяў грамадзян рэспублікі ў прафесійнай самарэалізацыі, давала ім магчымасць пашырэння, паглыблення, узнаўлення, набыцця прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў у адпаведнасці з інтарэсамі і сацыяльным заказам грамадства і дзяржавы. Аднак, як адзначаецца ў «Асноўных напрамках развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі», адобранай Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.04.99 № 500, рэальныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы, рашэнне комплексу пастаўленых перад адукацыяй краіны задач патрабуе пэўнай рэформы і далейшага развіцця структуры павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у напрамку стварэння стройнай і мабільнай сістэмы, якая дазволіць з улікам задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ажыццяўляць аператыўнае забеспячэнне Рэспублікі Беларусь нацыянальнымі кадрамі неабходнага ўзроўню кваліфікацыі. Менавіта гэтым было абумоўлена прыняцце Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь Пастановы № 1418 ад 14 кастрычніка 2002 г. «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у палажэнне а& йесперапынным прафесійным навучанні кіруючых работнікаў і спецыялістаў».

Як вядома, асноўным накірункам паслядыпломнай прафесійнай адукацыі спецыялістаў з'яўляецца павышэнне кваліфікацыі, якое ўяўляе сабой адукацыйны працэс, накіраваны на паглыбленне прафесійных